# РАЗДЗЕЛ IX

# МЕДЫЯКУЛЬТУРА І ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАЯ КРЫТЫКА

**Галіна Багданава**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)*

## ПЕРСПЕКТЫВЫ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ МАСТАЦТВА Ў НЕСПЕЦЫЯЛІЗАВАНЫХ ВЫДАННЯХ (на прыкладзе старонкі «Рэй» у «Настаўніцкай газеце»)

На пачатку XXI ст. для кагосьці нечакана, для кагосьці зусім натуральна практычна ўсе віды мастацтва набылі, так бы мовіць, другое дыханне. Не меншае гледачоў на выстаўках, на кінапрэм’ерах, у тэатральных і канцэртных залах. Тэлебачанне, інтэрнэт і, вядома ж, газеты спяшаюцца паведаміць пра тое, што можа зацікавіць сучаснага гледача. З беларускіх неспецыялізаваных СМІ найбольш паслядоўныя ў рэпрэзентацыі мастацтва такія выданні, як «Звязда» і «Настаўніцкая газета», дзе ёсць спецыяльныя старонкі, якія з’яўляюцца сістэматычна. Каб вызначыць перспектывы рэпрэзентацыі мастацтва на старонках сучасных друкаваных выданняў, спынімся на традыцыях падрыхтоўкі старонкі «Рэй» у «Настаўніцкай газеце».

Сёння, калі ў школу зноў вяртаецца такі прадмет, як «Сусветная мастацкая культура», калі мы клапоцімся пра развіццё творчых здольнасцей, выхаванне густу будучага пакалення, шмат што залежыць якраз ад узроўню дасведчанасці настаўнікаў, пераважная большасць якіх сістэматычна знаёміцца з матэрыяламі «Настаўніцкай газеты». Вядзе старонку «Рэй» выдатны журналіст, паэт Мікола Гілевіч (часцей падпісваецца Мікола Чэмер). Адразу варта адзначыць, што ў гэтага журналіста ёсць свая пазіцыя, свой уласны план рэпрэзентацыі беларускага і сусветнага мастацтва. І культурныя падзеі, якія з’яўляюцца аператыўнаю падставай для з’яўлення таго альбо іншага матэрыялу, натуральна ўпісваюцца ў агульную тканку «Рэя».

У старонкі ёсць і свая структура (рубрыкі), што значна аблягчае пошук неабходнага матэрыялу на старонках газеты і ў інтэрнэце: «Асобы»

(часцей інтэрв'ю з цікавымі дзеячамі культуры), «Вытокі» (прэзентацыя фальклорных традыцый і тых, хто іх працягвае), «Выставы» (не толькі ў сталіцы, але і ў невялікіх гарадах), «Мельпамена» (тэатральныя прэм'еры), «Кіно» (аўтары і найперш сам вядучы старонкі Мікола Чэмер сустракаюцца з вядомымі беларускімі і замежнымі кінематаграфістамі (падчас кінафестываляў), «Свет літаратуры», «Фестывалі», «Гісторыя» (назвы гавораць самі за сябе).

Сёння, каб спыніць увагу чытача, проста неабходны вобразныя, інтрыгоўныя загалоўкі. І тут паэтычны талент Міколы Чэмера адыгрывае вядучую ролю. Гутаркі ў рубрыцы «Асобы» часцей маюць, па сутнасці, загаловак-лід з цытатаю-словамі героя. Напрыклад, «Алесь Карлюкевіч: "Там у родных-паселішчах, у іх ваколіцах, – нашы душы і сэрцы…"» (09.01.2014), «Пісьменнік Сяргей Вераціла: "Я воўк-адзіночка…"» (01.02.2014), «Галіна Дзягілева: "Трэба любіць Беларусь моцна-моцна…"» (23.05.2015) і г. д. У рубрыцы «Вытокі» ёсць загалоўкі-сцвярджэнні: «Фальклор сёння ў модзе» (12.10.2013) (пра дзіцячы фальклорны калектыў «Крынічка»), у рубрыцы «Выставы» – загалоўкі-ацэнкі: «Адчуванне сям'і» (07.07.2018) (пра абарону дыпломных работ у БДАМ) і інш. Жывіць старонку і шырокае кола аўтараў. Апроч арт-журналістаў, мастацтвазнаўцаў гэта настаўнікі, вайскоўцы...

У якасці эксперымента, які, хочацца думаць, будзе замацаваны як добрая традыцыя, у інтэрнэце даецца відэазапіс выступлення цымбалісткі Валерыі Ільюшэнкі як ілюстрацыя да матэрыялу «Крэатыўная цымбалістка» (05.03.2016).

Вельмі цікава ўспрымаюцца і падборкі матэрыялаў (невялікія інтэрв'ю) Міколы Чэмера да свята 8 Сакавіка, дзе ён арыгінальна прадстаўляе жанчын-выкладчыц: «Кітаянка» (настаўніца кітайскай мовы сталічнай гімназіі № 23 Кацярына Макоска), «Культасветніца» (настаўніца выяўленчага мастацтва Святлана Жук), «Палымянка, тэатралка» (выкладчыца факультэта журналістыкі Алена Мальчэўская) (05.03.2016). Гэтыя падборкі з'яўляюцца ўжо некалькі гадоў.

Вядучы старонкі «Рэй» Мікола Чэмер заўжды вельмі шчыры, абавязкова выяўляе свой суб'ектыўны погляд на падзеі мастацтва. І гэта ж падтрымлівае ў кожнага з аўтараў. Менавіта шчырасць, суб'ектывізм сёння найбольш прыцягваюць чытача. З аднаго боку, аўтар дае ключ да разумення таго або іншага твора ці культурнай з'явы. З іншага – заахвочвае выказаць сваё меркаванне. Цяпер у газеты пішуць не так ча-

ста, але ж ёсць інтэрнэт, кнігі водгукаў на выстаўках… Нават калі публікацыя спыніць увагу гледача, ён задумаецца, убачыць нешта сваё – гэта выдатна. Нагадаем, што асноўныя чытачы газеты і рубрыкі «Рэй» – настаўнікі, тыя, хто падтрымлівае культуру, штодня вядзе дыялог з будучым пакаленнем.

Натуральным працягам плённай дзейнасці «Рэя» па папулярызацыі мастацтва і культуры стала выданне кнігі Міколы Чэмера «Рэй» у бібліятэчцы «Настаўніцкай газеты» [1].

Вельмі хацелася б, каб падобныя кнігі змаглі выдаць і іншыя рэдакцыі газет (у адзіным зборніку сабраць лепшыя публікацыі (інтэрв'ю, эсэ і інш.) пра літаратуру, мастацтва і культуру). Цяпер ёсць магчымасць іх выдатна праілюстраваць, дадаць дыскі з музычнымі запісамі, запісамі фільмаў, спектакляў. Гэта будзе выдатным дапаможнікам для выкладчыкаў не толькі сусветнай мастацкай культуры, але і літаратуры, гісторыі.

Такім чынам, гаворачы пра перспектывы рэпрэзентацыі мастацтва на старонках неспецыялізаваных выданняў, можна зрабіць наступныя высновы:

– рубрыкі альбо старонкі, прысвечаныя мастацтву, мусяць з'яўляцца сістэматычна;

– у супрацоўніка, які вядзе рубрыку (старонку), мусіць быць свая пазіцыя, свой уласны план рэпрэзентацыі беларускага і сусветнага мастацтва;

– старонка мусіць мець сваю структуру (рубрыкі);

– змяшчаць варта не толькі інфармацыйныя, але і аналітычныя матэрыялы;

– асаблівую каштоўнасць маюць гутаркі з дзеячамі літаратуры і мастацтва;

– сёння варта максімальна выкарыстоўваць каляровыя ілюстрацыі, дыскі з запісамі музыкі, кінафільмаў, спектакляў;

– для чытача проста неабходныя вобразныя, інтрыгоўныя загалоўкі;

– кола аўтараў мусіць быць як мага больш шырокім;

– шчырасць, суб'ектывізм сёння вельмі прыцягваюць чытача, выклікаюць на дыялог.

*Бібліяграфічныя спасылкі*

1. Чэмер, М. Рэй / Мікола Чэмер. – Мінск : Рэдакцыя газеты «Настаўніцкая газета», 2015. – 352 с.